УДК 373.5.016:811.161.3

# Фарміраванне тэкставай кампетэнцыі вучняў у кантэксце навучальнага эксперымента

**Л.С. Васюковіч**
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"*

*У артыкуле разглядаецца праблема фарміравання тэкставай кампетэнцыі вучняў. Паняцце трактуецца аўтарам як сукупнасць лінгвістычных і маўленчых ведаў, тэкставых уменняў, навыкаў і рацыянальных спосабаў дзейнасці з інфармацыяй, заключанай у вучэбным тэксце.*

*Мэта артыкула – абгрунтаваць метадычную сістэму фарміравання тэкставай кампетэнцыі, якая забяспечвае здольнасць моўнай асобы адэкватна ўспрымаць, разумець, выкарыстоўваць інфармацыю для аналізу чужых і стварэння ўласных тэкстаў.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыялам даследавання паслужылі вынікі педагагічнага эксперымента, які праводзіўся з мэтай вызначыць кампаненты метадычнай сістэмы фарміравання тэкставай кампетэнцыі: падыходы, прынцыпы навучання, задачы, зместавыя напрамкі і эфектыўнасць эксперыментальнай працы.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *У выніку праведзенага даследавання даказана мэтазгоднасць увядзення інтэграванага паняцця кампетэнцыі, канкрэтызаваны кампаненты метадычнай сістэмы фарміравання тэкставай кампетэнцыі вучняў. З улікам акрэсленых прынцыпаў, мэты, задач, зместу, метадаў распрацаваная сістэма ўключала тры этапы: інфармацыйна-аналітычны, аналітыка-прадуктыўны, прадуктыўна-творчы. Мэта і задачы навучальнага эксперымента вызначылі зместавыя лініі эксперыментальнай працы, што забяспечылі фарміраванне і развіццё метапрадметных, універсальных уменняў тэкставай кампетэнцыі, скіраваных на асэнсаванае ўспрыманне, разуменне вучэбных лінгвістычных тэкстаў.*

***Заключэнне.*** *Распрацаваная метадычная сістэма фарміравання тэкставай кампетэнцыі забяспечвае выпрацоўку базавых уменняў вучняў: аналізаваць логіка-кампазіцыйную структуру зыходнага тэксту, ствараць і ацэньваць уласны тэкст з пазіцыі зместу, структуры, маўленчага афармлення.*

***Ключавыя словы:*** *тэкставая кампетэнцыя, вучэбны тэкст, тэкставыя ўменні, метадычная сістэма фарміравання кампетэнцыі.*

# Shaping Textual Competence of Pupils in the Context of the Educational Experiment

**L.S. Vasyukovich**
*Educational establishment «Vitebsk State P.M. Masherov University»*

*The issue of shaping the textual competence of pupils is considered in the article.Textual competence is interpreted by the author as a set of linguistic knowledge and speech, word skills and rational ways of activity with the information contained in the educational text.*

*The purpose of the article is to justify shaping of methodical system of textual competence, which provides the ability of a language person to perceive, to understand, to use the information for analyzing others' texts and creating their own ones.*

***Material and methods.*** *Basic methods are the analysis of the literature on the research issue, the pedagogical experiment that allows determining the components of methodological system of shaping textual competence: approaches, teaching principles, objectives, content areas and findings of the experimental work.*

***Findings and their discussion.*** *The research study has proved the expediency of introducing the concept of integrated competence, the work content and the components of methodological system used in the shaping the textual competence of pupils. The process of shaping the textual competence, based on the certain principles, goals, objectives, contents, methods, involves three phases: information-analytical, analytical-productive, productive-creative.*

***Conclusion.*** *The developed methodological system provides shaping basic text skills: the ability to analyze the logical-compositional structure of the source code, to create and to evaluate your own text from the perspective of content, structure and speech processing.*

***Key words:*** *textual competence, academic text, text skills, methodological system of shaping the competence.*

Першае дзесяцігоддзе XXI стагоддзя ў тэорыі і практыцы навучання беларускай мове пазначана станаўленнем катэгорый *кампетэнцыя/кампетэнтнасць*. Сённяшні этап развіцця моўнай адукацыі характарызуецца тым, што шматлікія даследаванні кампетэнцыі вылучаюць, дэталізуючы паняцце, ад 3 да 30 яе разнавіднасцей. Працэс навучання пры гэтым разглядаецца як фарміраванне *кампетэнцыі* (нормы, зададзенай вучэбнай праграмай) і

*кампетэнтнасці* як выніковага адукацыйнага прадукта.

Большасць вучоных сыходзяцца на тым, што кампетэнтнасны падыход у кантэксце трактоўкі вучэбных дасягненняў арганічна ўзаемазвязаны з ідэямі камунікатыўнай методыкі ў выкладанні мовы (А.А. Быстрова, Т.К. Данская, С.І. Львова, Л.В. Чарапанава, Я.І. Пасаў і інш.). Тэорыя кампетэнтнасці была заклікана вырашыць супярэчнасць паміж "неадпаведнасцю падрыхтоўкі выпускнікоў адукацыйных устаноў і запытамі грамадства, патрэбнасцямі рынку працы" [1, с. 15]. Сярод шматлікіх у сучаснай навуковай літаратуры азначэнняў мы вылучаем пазіцыю А.В. Хутарскога, паводле якой *кампетэнтнасць* расцэньваецца як "валоданне чалавекам адпаведнай кампетэнцыяй, што ўключае яго асобасныя адносіны да прадмета дзейнасці", а *кампетэнцыя* разглядаецца як "сукупнасць узаемазвязаных якасцей асобы (ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці), зададзеных у адносінах да пэўнага круга прадметаў і працэсаў, неабходных для якасна прадуктыўных дзеянняў" [2, с. 60]. З гэтых пазіцый неправамерна сцвярджаць, што кампетэнцыі прыйшлі на змену ведам. Паняцце кампетэнцыі мае шэраг адрозненняў. Галоўнае адрозненне ў тым, што кампетэнцыя падразумявае "ўзаемазвязаныя якасці асобы – веды, уменні, навыкі і *спосабы дзейнасці*" [1, с. 7]. Спосабы дзейнасці ў рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу ўсведамляюцца як найважнейшы кампанент уменння. Пры гэтым "засваенне спосабаў дзейнасці мае на ўвазе асэнсаванне зместу, структуры і паслядоўнасці вучэбных дзеянняў" [3, с. 213].

У кантэксце кампетэнтнаснага падыходу вылучым ролю і месца *тэкставай кампетэнцыі* і яе дыялектычныя сувязі з іншымі відамі кампетэнцый у моўнай адукацыі вучняў. Перш за ўсё адзначым, што пры разглядзе кампетэнтнасці як асновы любой дзейнасці вучоныя выдзяляюць наступныя абавязковыя кампаненты саставу: "*Веды,* якія знаходзяцца ў аснове выбару спосабу ажыццяўлення адпаведнай дзейнасці, *вопыт* паспяховай рэалізацыі дзейнасці на базе ведаў, *пазітыўную матывацыю* да праяўленняў кампетэнцыі, *асобасныя якасці,* якія садзейнічаюць эфектыўнаму вырашэнню … праблем" [4, с. 78]. У адпаведнасці з даследаванай праблемай мэту артыкула сфармулюем наступным чынам: абгрунтаваць метадычную сістэму фарміравання тэкставай кампетэнцыі, якая забяспечвае здольнасць моўнай асобы адэкватна ўспрымаць, разумець, выкарыстоўваць інфармацыю для аналізу чужых і стварэння ўласных тэкстаў.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі вынікі педагагічнага эксперымента, які праводзіўся з мэтай вызначыць кампаненты метадычнай сістэмы фарміравання тэкставай кампетэнцыі: падыходы, прынцыпы навучання, задачы, зместавыя напрамкі і эфектыўнасць эксперыментальнай працы. Распрацаваная методыка ўводзілася ў школьную практыку ў ходзе навучальнага эксперымента, у працэсе якога вопытным навучаннем было ахоплена 257 вучняў (дзяржаўныя ўстановы адукацыі "Арэхаўская СШ", "Іллюшынская СШ" Ушацкага раёна, "СШ № 21 г. Оршы", "СШ № 7 г. Оршы", "Асвейская СШ" Верхнядзвінскага раёна, "Бярозкаўская СШ" Докшыцкага раёна). Адзначым, што прапанаваная методыка прайшла праверку і ў эксперыментальных школах Рэспублікі Беларусь (у межах эксперымента, які праводзіўся Нацыянальным інстытутам адукацыі).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Зыходзячы з саставу абавязковых кампанентаў, задач сучаснай моўнай адукацыі, з улікам праведзеных даследаванняў, у якіх вылучаецца тэкставая кампетэнцыя (Н.А. Іпалітава, Ж.В. Караленка, Т.В. Кошачкіна, Н.Ш. Сайфутдзінава, І.В. Салосіна, Г.А. Сідарава), вылучым аспекты, істотныя для вызначэння сутнасці тэкставай кампетэнцыі як інтэграванага паняцця:

- неабходнасць удасканалення сучаснага адукацыйнага працэсу патрабуе фарміравання моўнай асобы, якая валодае тэкставай кампетэнцыяй – уменнямі аналізаваць і ствараць тэксты ў розных відах маўленчай дзейнасці;
- тэкставая кампетэнцыя забяспечвае тэкставую дзейнасць асобы (А.Г. Баранаў, Н.С. Болатнава, Т.М. Дрыдзе і інш.). Зазначым, што некаторыя даследчыкі (напрыклад, А.Г. Баранаў) ставяць знак тоеснасці паміж паняццямі "пазнавальна-камунікатыўная дзейнасць" і "тэкставая дзейнасць". Асобныя вучоныя лічаць, што ў метадычных адносінах гэтыя паняцці не раўнацэнныя: "Пад тэкставай кампетэнцыяй мэтазгодна разумець сукупнасць толькі тых уяўленняў, ведаў і навыкаў, якія забяспечваюць прадуцыраванне тэкстаў.., дэманструюць валоданне нормаў тэкстаўтварэння [5, с. 201]. Мы пад *тэкставай дзейнасцю* разумеем адэкватнае ўспрыманне і разуменне тэкстаў з мэтай выкарыстання іх зместу для аналізу і стварэння ўласных;
- адукацыйныя дасягненні, паводле сучасных трактовак, арыентаваны на камунікатыўныя ўменні, якія ўключаюць "уменні дакладна выказ-

ваць свае думкі вусна і пісьмова, слухаць і разумець іншых, разумець і аналізаваць прачытаны тэкст; уменне працаваць з інфармацыяй, прадстаўленай у разнастайным выглядзе” [6, с. 76];

▪ сфарміраваныя ўменні працы з тэкстам асабліва значымыя на завяршальным этапе навучання ў школе як неабходныя для далейшай вучобы і прафесійнай дзейнасці.

Некаторыя вучоныя паняцце тэкставай кампетэнцыі трактуюць як састаўную частку (субкампетэнцыю) лінгвістычнай: “Тэкставая кампетэнцыя, якая ўваходзіць у састаў лінгвістычнай кампетэнцыі, – гэта здольнасць вучня да сэнсавай апрацоўкі інфармацыі тэксту, якая выдзяляецца і ўсведамляецца ў выніку розных відаў чытання” [7, с. 17]. Нам бачыцца мэтазгодным разглядаць тэкставую кампетэнцыю як самастойную катэгорыю, паколькі вынікі сучаснай моўнай адукацыі асэноўваюцца не як аб’ём засвоеных ведаў, а як узровень сфарміраванасці ўніверсальных уменняў на аснове працы з вучэбнымі тэкстамі. Лічым правамерным і неабходным увесці паняцце **тэкставая кампетэнцыя** з улікам наступных пазіцый.

Сённяшнія праграмы і падручнікі па мове, як вядома, фармулююць і рэалізуюць такія асноўныя задачы, як фарміраванне моўнай, камунікатыўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый. Аднак у працэсе развіцця паглыбленне, дэталізацыя паняцця лагічна прыводзяць да дыферэнцыяцыі, вылучэння яго шматлікіх разнавіднасцей. Найбольш актыўна даследуюцца: моўная, лінгвістычная, маўленчая, камунікатыўная, сацыякультурная, краіназнаўчая (або этнакультуразнаўчая) кампетэнцыі. У найноўшых метадычных працах актуалізуюцца правапісная, фанетычная, граматычная, рытарычная і іншыя разнавіднасці кампетэнцый.

Ускладненне і ўдакладненне навуковага паняцця на пэўным этапе выклікае супрацьлеглую тэндэнцыю – імкненне вылучыць інтэграваную адзінку, спалучыўшы, аб’яднаўшы састаўныя кампаненты праз раўналежны тэрмін. На нашу думку, імкненне развесці разнавіднасці кампетэнцыі прыводзіць да сінтэзу і накладання паняццяў, паколькі камунікатыўныя ўменні развіваюцца ў выніку засвоенасці правілаў моўнай сістэмы. Тым больш, што цяжка, мабыць, і немагчыма пры непасрэдных зносінах дыферэнцыраваць, што прадыктавана вопытам маўленчай практыкі, што – веданнем лінгвістычных правілаў. Аптымальным у кантэксце нашага даследавання бачыцца ўвядзенне паняцця тэкставай кампетэнцыі. Чым выклікана неабходнасць актуалізацыі гэтага паняцця?

*Па-першае*, вычляненне тэарэтычных састаўных навуковага паняцця, як правіла, перажывае натуральны шлях дыферэнцыяцыі як складаны градуіраваны працэс пошукаў унутранага, глыбіннага сэнсу. Аднак дэталізацыя паняцця ў аб’ёме 10–12 разнавіднасцей кампетэнцыі можа мець толькі тэарэтычную цікавасць. У практычным плане звесці гэтую стракатасць, разнароднасць у адно цэлае ўяўляе сабой малапрадуктыўную задачу. Перспектыўным бачыцца ўвядзенне інтэграванай адзінкі, што адлюстроўвае істотныя, канстытутыўныя характарыстыкі. У гэтых адносінах тэкставая кампетэнцыя расцэньваецца намі як комплекснае паняцце, базіснымі састаўнымі якога выступаюць веданне сістэмы мовы (моўная кампетэнцыя) і ўменне адэкватна ўспрымаць, аналізаваць чужыя і прадуцыраваць, карэкціраваць уласныя тэксты (камунікатыўная кампетэнцыя).

*Па-другое*, тэкставыя ўменні на сённяшні дзень кваліфікуюцца як вядучыя, універсальныя, інтэлектуальныя. Міжнародныя даследаванні адукацыйных дасягненняў вучняў PISA, PIRLS прадэманстравалі запатрабаванасць уменняў шукаць, распазнаваць, інтэрпрэтаваць інфармацыю, захоўваць логіку, паслядоўнасць пры выкарыстанні вербальных і невербальных кампанентаў тэксту з мэтай дасягнення камунікатыўных задач. У праведзеным даследаванні самы высокі ўзровень вучэбных дасягненняў дэманстраваў разуменне зместу складанага тэксту, уменне даць уласную ацэнку прапанаванай інфармацыі, сфармуляваць гіпотэзу, зрабіць вывад. У сярэднім гэта аказалася даступным для 10% 15-гадовых падлеткаў усіх краін, што прымалі ўдзел у абследаванні. У краінах-лідарах такіх вучняў было ад 15 да 19%, у Расіі – усяго 3% [8, с. 8]. Як бачым, уменне працаваць з тэкстам, выконваць комплексныя заданні на яго аснове, рабіць крытычны аналіз інфармацыі правамерна лічыцца адным з самых запатрабаваных, неабходным для паспяховай адаптацыі ў сучасным грамадстве. Невыпадкова “фарміраванне навыкаў самастойна працаваць з такой моўнай адзінкай, як тэкст, успрымаецца сёння як найважнейшая задача школьнай моўнай адукацыі” [9, с. 118].

*Па-трэцяе*, ва ўмовах вучэбнай камунікацыі праблема фарміравання тэкставай кампетэнцыі лагічна перарастае ў праблему працы з тэкстам. Дэклараваны тэкстацэнтрычны прынцып выкладання мовы часам разумеецца надзвычай спрошчана: як пераважнае выкарыстанне тэкстаў замест практыкаванняў на аснове слоў,

словазлучэнняў, асобных сказаў. Аднак гэта фармальны бок праблемы. Праца з тэкстамі ў сённяшнім падручніку не прадстаўлена сістэмна. Адсутнасць выверанай методыкі працы з тэкстам прыводзіць да абсалюту рэпрадуктыўных формаў: *прачытайце і перакажыце (раскажыце, адкажыце на пытанні), пра што гаворыцца ў тэксце. Ці спадабалася вам апавяданне*? і інш., што, у сваю чаргу, вядзе да адсутнасці ў вучняў унутранай патрэбы зносін на аснове здабытай інфармацыі. Належная праца з тэкстам будзе адэкватнай ідэям камунікатыўна-дзейнаснага падыходу пры ўмове, калі тэкст успрымаецца як ведавая і дзейнасная аснова.

*Па-чацвёртае*, сённяшняя тэкставая аснова падручнікаў па мове не выклікае нараканняў. Этнакультурная, культуралагічная арыентацыя вучэбных тэкстаў вартая адназначнага адабрэння. Аднак часам гэтая сума тэкстаў уяўляе сабой “склад” інфармацыі. Наспела патрэба тэарэтычна абгрунтаваць і ўкараніць у практыку выкладання сістэму фарміравання тэкставых уменняў. На думку Л.А. Мурынай, “школьны курс мовы, прадстаўлены ў падручніках, грунтуецца на запамінанні фармулёвак, правіл і знаёмстве вучняў з самымі простымі прыёмамі, што дазваляюць аўтаматычна прымяняць правілы... Аўтар падручніка (услед за ім і настаўнік) паведамляе фактычна ўласныя вывады, адаптаваныя для дзіцячага ўспрымання, пры гэтым выключаецца самае істотнае: якім спосабам атрыманы вывады” [10, с. 10–11]. Тэкставая дзейнасць павінна забяспечваць працэсуальны аспект навучання, у якім пераважае не засваенне інфармацыі, а працэс фарміравання ўменняў на аснове ведаў. Назапашванне, актывізацыя спосабаў дзейнасці ствараюць аптымальныя ўмовы для аналізу чужых тэкстаў і падрыхтоўкі ўласных на ўзор або па мадэлі, прапанаванай падручнікам.

Такім чынам, кампетэнтнасны падыход да навучання мове абумоўлівае змест і структуру тэкставай кампетэнцыі. Яе аснову складаюць веды, уменні і спосабы дзейнасці, якімі павінны авалодаць вучні для рацыянальнай шматаспектнай працы з тэкстам. Адэкватныя вынікі кампетэнцыі залежныя “не толькі ад выражэння структурна-кампазіцыйнага і зместавага планаў вучэбных тэкстаў, але і ад таго, як арганізуецца праца па ўспрыманні і асэнсаванні вучэбнай інфармацыі” [11, с. 8]. Структура *камунікатыўнай кампетэнцыі* уяўляе сабой іерархію кампанентаў: тэкстазнаўчая тэорыя – *веды пра тэкст*, акрэсленыя праграмай (напрыклад, тэкст як адзінка сінтаксісу і звязнага маўлення; асноўныя прыметы тэксту: сэнсавае і граматычнае адзінства, звязнасць, завершанасць; лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя сродкі арганізацыі тэксту і г.д.); *тэкставыя ўменні*, якія ў кантэксце нашага даследавання мы разумеем як гатоўнасць да працы па інтэрпрэтацыі і стварэнні выказванняў; *спосабы дзейнасці,* якімі павінен валодаць вучань для працы з тэкстам.

Тэкставая кампетэнцыя на сённяшні дзень арганічна ўключае інфармацыйную састаўную. Адпаведна з улікам сучасных адукацыйных рэалій *тэкставая кампетэнцыя* трактуецца намі як інтэгратыўная цэласнасць ведаў, уменняў і станоўчага маўленчага вопыту, што забяспечваюць паўнацэнную дзейнасць, скіраваную на ўспрыманне, інтэрпрэтацыю “гатовых” і стварэнне ўласных тэкстаў. Мэтазгоднасць увядзення паняцця запатрабавана асаблівасцямі развіцця сучаснага грамадства і належным (дастатковым і неабходным) узроўнем моўнай адукацыі. Паспрабуем аргументаваць сваю пазіцыю.

Тэкставая кампетэнцыя мае на ўвазе не толькі сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў у аспекце ўспрымання, стварэння тэксту, але і агульную культуру асобы, што падразумявае ўсе формы працы з інфармацыяй. Прагматычная каштоўнасць састаўной кампетэнцыі заключаецца ў тым, што змест і аб’ём яе базавых элементаў дазваляюць звесці бясконцае мноства тэкстаў да пэўнага набору іх тыпаў, да сукупнасці істотных, катэгарыяльных прымет. Інфармацыйны кампанент мае на ўвазе засваенне абагульненых спосабаў працы з тэкставай інфармацыяй: яе атрыманне, назапашванне, кадзіраванне, перапрацоўку, стварэнне новай, перадачу і практычнае прымяненне. Гэта азначае, што змест, вартасці тэкставай інфармацыі залежаць як ад яе стваральнікаў, так і ад спажыўцоў, атрымальнікаў, інфармацыйная культура якіх можа быць высокай і нізкай. Адпаведна праца з тэкстам у шырокім сэнсе, апроч уласна тэкставых уменняў, падразумявае здольнасць атрымліваць якасную інфармацыю і ўменне карыстацца, аптымальна распараджацца ёю.

Вылучэнне тэкставай кампетэнцыі мэтазгоднае ў кантэксце дыдактычных функцый вучэбнага тэксту. Так, адной з вядучых функцый выступае інфармацыйная, якая падразумявае “фіксацыю прадметнага зместу адукацыі і відаў дзейнасці, якія павінны быць сфарміраваны пры вывучэнні вучэбных прадметаў, з вызначэннем абавязковага аб’ёму інфармацыі” [12, с. 59]. З пазіцый тэкставай кампетэнцыі інфармацыйная функцыя не абмяжоўваецца прызначэннем вучэбнага тэксту як носьбіта зместу моўнай

адукацыі. Тэкст павінен выступаць і лінгваметадычным сродкам, закліканым навучыць сістэматызаваць, ранжыраваць звесткі, змешчаныя ў вучэбнай кнізе.

У сувязі з тым, што вучэбная інфармацыя ў сваім закончаным варыянце афармляецца ў выглядзе тэксту, уменні па яе перапрацоўцы расцэньваюцца намі як *тэкставыя*. У выніку ўменне слухаць мы трактуем як уменне разумець інфармацыю, успрынятую на слых, уменне чытаць – як уменне ўсведамляць звесткі, заключаныя ў пісьмовым тэксце, уменне гаварыць і пісаць – перадаваць інфармацыю ў вуснай і пісьмовай формах. Пад *тэкставымі* разумеем уменні, арыентаваныя на дэталёвае чытанне вучэбных тэкстаў: засваенне зместу тэксту, яго разуменне, знаходжанне і ранжыраванне інфармацыі, яе інтэрпрэтацыю, ацэнку.

Метадычная сутнасць рэфлексійных уменняў трактуецца як уменне асэнсоўваць маўленчы вопыт, кантраляваць логіку і спосабы ўласнай дзейнасці, усведамляць спецыфіку моўных з'яў, фіксаваць увагу на дапушчаных памылках, аналізаваць іх прычыны, прагназаваць адэкватныя прыёмы працы з чужымі і ўласнымі тэкстамі.

Такім чынам, тэкставая кампетэнцыя разглядаецца як цэласнае паняцце, як сінтэз кампанентаў моўнай і камунікатыўнай кампетэнцый. Рацыянальнасць сінтэзу кампетэнцый пацвярджаецца інтэгратыўным паказчыкам – уменнем ствараць уласны тэкст у адпаведнасці з сітуацыяй, сферай, задачай і маўленчымі сродкамі зносін. Улічваючы, што кампетэнтнасны падыход падразумявае выразную арыентацыю не толькі на веды, уменні і навыкі, але і спосабы дзейнасці, мы прапануем наступнае азначэнне адзінкі. **Тэкставая кампетэнцыя** – сукупнасць лінгвістычных і маўленчых *ведаў*, тэкставых *уменняў, навыкаў* і рацыянальных *спосабаў дзейнасці* з інфармацыяй, заключанай у вучэбным тэксце. Тэкставыя ўменні, скіраваныя на працу з тэкстам, на сённяшні дзень расцэньваюцца як выніковыя, метапрадметныя ў кантэксце вывучэння мовы.

Распрацаваная метадычная сістэма пабудавана на аснове вядучых *дыдактычных* (прынцып навуковасці, сістэмнасці, сувязі тэорыі з практыкай, свядомасці і актыўнасці, нагляднасці, паслядоўнасці, спалучэння індывідуальнага і калектыўнага навучання, даступнасці вучэбнага матэрыялу) і сфармуляваных намі *лінгваметадычных прынцыпаў*, якія абумовілі змест і арганізацыю вопытна-эксперыментальнай працы:

– прынцып навучання беларускай мове *ад тэксту да тэксту*: ад вучэбнага тэксту – праз яго аналіз, разуменне, інтэрпрэтацыю – да стварэння ўласнага на базе зыходнага;

– *прынцып дыялектычнага фарміравання тэкставай кампетэнцыі* рэалізуецца ў двух аспектах. Па-першае, кампетэнцыя як зыходная здольнасць, неабходная для ажыццяўлення маўленчай дзейнасці, выступае не толькі перадумовай, але і вынікам навучання. Па-другое, фарміраванне кампетэнцый уяўляе сабой дыялектычны ўзаемаабумоўлены працэс: моўная кампетэнцыя развіваецца ў працэсе станаўлення камунікатыўнай, камунікатыўная – праз развіццё моўнай. Зазначым, што дыферэнцыяцыя, размяжаванне тэкставых уменняў мае адносны характар. Нягледзячы на розніцу ў вызначаных уменнях (аналізаваць, узнаўляць і ствараць тэкст), паміж імі назіраецца дыялектычнае адзінства, якое вынікае з агульнасці маўленчых механізмаў успрымання і стварэння тэкстаў. Успрыманне і стварэнне адзінкі – гэта два ўзаемаабумоўленыя аспекты тэкставай дзейнасці. Пры фарміраванні ўменняў успрымаць, аналізаваць зыходныя тэксты выпрацоўваецца ўменне ствараць уласныя. Ведаючы правілы, паводле якіх пабудаваны тэкст, вучань свядома, згодна з гэтымі правіламі, стварае ўласны;

– *прынцып аптымальных суадносін рэпрадуктыўных і прадуктыўных уменняў* у працэсе фарміравання тэкставай кампетэнцыі. У адпаведнасці з названым прынцыпам заданні ў сістэме эксперыментальнага навучання скіраваны на аналіз, трансфармацыю, узнаўленне лінгвістычнай інфармацыі праз складанне планаў, тэзісаў, канспектаў, анатацый. Такія заданні кваліфікуем як рэпрадуктыўна-прадуктыўныя, арыентаваныя на аналіз вучэбнага тэксту і стварэнне ўласнага, што падразумявае спалучэнне стандартызаваных і творчых, ацэначных кампанентаў;

– *прынцып камунікатыўнасці* забяспечвае мэтанакіраванае навучанне мове ў рэчышчы тэкставай дзейнасці. У працэсе фарміравання моўнай і камунікатыўнай кампетэнцый успрыманне, аналіз тэкстаў і стварэнне ўласных – узаемазвязаныя, узаемаабумоўленыя кампаненты дзейнасці. Пры гэтым якасць аналізу, адэкватнасць разумення "чужых", а таксама ўзровень рэфлексіі, ацэнкі ўласных тэкстаў прадвызначаюць эфектыўнасць фарміравання кампетэнцый вучняў;

– *прынцып развіцця базавых інтэлектуальных уменняў*. Сутнасць прынцыпу заключаецца ў тым, што сістэма заданняў на аснове вучэбных тэкстаў павінна быць разлічана на засваенне базавых уменняў (выкананне аперацый аналізу і сінтэзу, абстрагавання і канкрэтызацыі, параўнання і аналогіі, абагульнення і дыферэнцыяцыі, класі-

<table>
<tr><td rowspan="12">Этапы працэсу фарміравання кампетэнцый</td><td colspan="12">ПАДЫХОДЫ</td><td rowspan="12">Лінгваметадычныя ўмовы эфектыўнасці методыкі</td></tr>
<tr><td colspan="3">Сістэмна-функцыянальны</td><td colspan="3">Камунікатыўна-дзейнасны</td><td colspan="3">Лінгвакультуралагічны</td><td colspan="3">Кампетэнтнасны</td></tr>
<tr><td colspan="12">ПРЫНЦЫПЫ</td></tr>
<tr><td colspan="12">дыялектычнага фарміравання моўнай і камунікатыўнай кампетэнцый, навучання мове ад тэксту да тэксту, камунікатыўнасці, тэкстацэнтрычнасці, аптымальных суадносін рэпрадуктыўных і прадуктыўных тэкставых уменняў</td></tr>
<tr><td colspan="12">МЭТА І ЗАДАЧЫ: фарміраванне тэкставай кампетэнцыі (лінгвістычных і маўленчых паняццяў, лінгва-маўленчых уменняў і спосабаў дзейнасці) вучняў на аснове сістэмы тэкстаў школьных падручнікаў па беларускай мове</td></tr>
<tr><td colspan="12">ЗМЕСТАВЫЯ НАПРАМКІ ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЙ ПРАЦЫ</td></tr>
<tr><td colspan="4">Навучанне лінгвістычнай тэрміналогіі</td><td colspan="4">Методыка коплекснага аналізу вучэбнага тэксту</td><td colspan="4">Навучанне стварэнню тэкстаў на базе вучэбных</td></tr>
<tr><td colspan="12">МЕТАДЫ І ФОРМЫ ПРАЦЫ, СІСТЭМА ПРАКТЫКАВАННЯЎ</td></tr>
<tr><td colspan="12">ВЫНІКІ</td></tr>
<tr><td colspan="12">Лінгва-маўленчыя веды, тэкставыя ўменні, спосабы дзейнасці, разуменне, аналіз, сінтэз, ацэнка тэкстаў, стварэнне ўласных</td></tr>
</table>

Мал. **Метадычная сістэма фарміравання тэкставай кампетэнцыі вучняў.**

фікацыі і сістэматызацыі, выдзяленне галоўнага, азначэнне паняццяў);

– сутнасць прынцыпу *тэкстацэнтрычнасці* заключаецца ў тым, што сістэма тэкстаў падручніка забяспечвае базу і ўмовы для фарміравання навыкаў слухання, гаварэння, чытання, пісьма. Фарміраванне тэкставай кампетэнцыі ажыццяўляецца ў працэсе асэнсавання, аналізу, перапрацоўкі інфармацыі, пададзенай у вучэбных тэкстах. Сістэма тэкстаў падручніка выступае асновай для наладжвання вучэбных дыялогаў, скіраваных да тэксту, настаўніка, аўтара, субяседніка.

Аналіз літаратуры па праблеме, вызначэнне тэарэтыка-метадалагічных асноў даследавання, вынікаў канстатавальнага эксперымента выступілі базай для падрыхтоўкі праграмы эксперыментальнага навучання. Распрацаваная праграма навучальнага эксперымента вырашала наступныя задачы:

- акрэсліць падыходы і прынцыпы эксперыментальнага навучання;
- вызначыць аб'ём тэарэтычных звестак (як арыенціровачнай асновы дзейнасці), неабходных для фарміравання тэкставай кампетэнцыі;
- выявіць комплекс апорных тэкставых уменняў, неабходных для аналізу "чужых" і стварэння ўласных тэкстаў;
- акрэсліць этапы, сістэму метадаў і прыёмаў для ўвядзення новай інфармацыі, паслядоўнасць у фарміраванні тэкставых уменняў;
- распрацаваць сістэму практыкаванняў, адпаведную логіцы паэтапнага фарміравання тэкставых уменняў.

Праграма эксперыментальнага навучання, арыентаваная на паглыбленне ведаў пра змест і структуру вучэбных тэкстаў навуковага стылю, уключала наступныя тэматычныя блокі: агульная характарыстыка і спецыфічныя рысы тэкстаў навуковага стылю, аналіз навуковага тэксту, лінгвістычная тэрміналогія як лексічнае ядро вучэбнага тэксту, план вучэбнага тэксту, тэзісы і іх разнавіднасці, канспект як аналітыка-сінтэтычная перапрацоўка інфармацыі зыходнага тэксту; віды канспектаў, рэферыраванне і анатаванне навуковых тэкстаў, артыкул як навуковы тэкст, слоўнікі, даведачная навуковая літаратура, іх інфармацыйныя магчымасці.

Заняткі па прапанаваных тэмах, як правіла, будаваліся па схеме: паведамленне тэорыі, трансфармацыя тэарэтычных звестак у тую ці іншую графічную форму, выкананне практыкаванняў, самастойная праца. У працэсе эксперыментальнага навучання актыўна выкарыстоўваліся *метады* арганізацыі пазнавальнай дзейнасці, матывацыі і стымулявання

працэсу навучання, метады самастойнай працы. Асноўнымі *відамі практычных работ* выступалі: канспектаванне лекцый, паведамленні вучняў, складанне абагульняльных табліц, схем, аналіз тэкстаў, аналіз і складанне слоўнікавых артыкулаў, вядзенне тэрміналагічных слоўнікаў, праца з лінгвістычнымі даведнікамі, складанне анатацый, канспектаў, планаў навуковых тэкстаў, падрыхтоўка рэферата лінгвістычнай тэматыкі, аналіз навуковых артыкулаў і г.д.

Як вядома, фарміраванне любых пазнавальных аперацый, уменняў у сістэмным выглядзе падразумявае мэтанакіраванасць, паслядоўнасць працэсу. Рэалізацыя эксперыментальнага навучання прадугледжвала наступную логіку фарміравання тэкставых уменняў: ***аналітычныя,*** скіраваныя на адэкватнае ўспрыманне, разуменне і аналіз інфармацыі; ***аналітыка-прадуктыўныя***, арыентаваныя на ўзнаўленне, вытлумачэнне, інтэрпрэтацыю адзінкі; ***творчыя***, прызначаныя для стварэння ўласнага тэксту на аснове зыходнага. Абраная логіка эксперыментальнага навучання абапіраецца на працы Б.І. Фёдарава, у якіх уменні суадносяцца з пазнавальнымі функцыямі: апісальнай, вытлумачальнай і прагнастычнай [12, с. 37]. Эксперыментальнае навучанне праходзіла на аснове сістэмы практыкаванняў, пры распрацоўцы якой улічваліся наступныя фактары:

– *лінгвістычны*, які адлюстроўвае сістэмны характар моўнага матэрыялу, забяспечвае фарміраванне моўнай кампетэнцыі;

– *метадычны*, што прагназуе працэс аптымальнага навучання, выразную пастаноўку лінгвістычных задач і выбар адпаведных спосабаў дзейнасці;

– *псіхалагічны*, які прадугледжвае паслядоўнасць, паэтапнасць фарміравання моўных і камунікатыўных уменняў, свядомасць, рацыянальнасць выканання вучэбных дзеянняў;

– *комплексны*, які забяспечвае арыентацыю заданняў на фарміраванне ўніверсальных уменняў (пошук, перапрацоўка і выкарыстанне інфармацыі ў вучэбных тэкстах). Эксперыментальнае навучанне ўключала *сістэму практыкаванняў*, адпаведную логіцы паэтапнага фарміравання тэкставых уменняў:

1. **Аналітычныя** практыкаванні, што фарміруюць:

а) *апазнавальныя* вучэбныя ўменні (распазнаваць адзінкі і з’явы ў тэксце, выдзяляць істотныя і неістотныя прыметы паняццяў, параўноўваць, супастаўляць, размяжоўваць моўныя з’явы);

б) *класіфікацыйныя* вучэбныя ўменні (групаваць вывучаныя з’явы на пэўнай аснове, устанаўліваць родава-відавыя адносіны паняццяў, вызначаць аснову для групоўкі, класіфікацыі моўных з’яў, будаваць табліцы, схемы).

2. **Аналітыка-прадуктыўныя** практыкаванні, скіраваныя на фарміраванне ўменняў рэдагаваць інфармацыю, падбіраць, ужываць моўныя адзінкі паводле мадэлі, схемы, алгарытму, узору.

3. **Творчыя** практыкаванні, арыентаваныя на фарміраванне сінтэтычных *уменняў* (канструяваць, трансфармаваць інфармацыю, пераказваць вучэбныя тэксты, складаць уласныя).

У агульным выглядзе метадычная сістэма фарміравання тэкставай кампетэнцыі прадстаўлена на мал.

Такім чынам, з улікам акрэсленых прынцыпаў, мэты, задач, зместу, метадаў фарміраванне тэкставай кампетэнцыі ўключае тры этапы: *інфармацыйна-аналітычны, аналітыка-прадуктыўны, прадуктыўна-творчы*.

З улікам мэты і задач навучальнага эксперымента *зместавыя лініі* эксперыментальнай працы вызначалі асноўныя вектары, што забяспечвалі фарміраванне і развіццё метапрадметных, універсальных уменняў тэкставай кампетэнцыі, скіраваных на асэнсаванае ўспрыманне, разуменне вучэбных лінгвістычных тэкстаў:

1) засваенне паняційнай базы вучэбнага прадмета *беларуская мова,* навучанне лінгвістычнай тэрміналогіі, праца з азначэннямі мовазнаўчых паняццяў. Вылучэнне гэтага вектара прызнаецца як абавязковы этап працы з вучэбнымі тэкстамі падручнікаў: да “найважнейшых агульнапрадметных уменняў адносяцца: а) асэнсаванае ўспрыманне і сэнсавая парапрацоўка лінгвістычнага тэксту; б) азначэнне навуковых паняццяў” [3, с. 155];

2) аналіз зместу і структуры тэксту як умова разумення лінгвістычнай інфармацыі; узнаўленне, інтэрпрэтацыя зыходнага тэксту;

3) стварэнне ўласных тэкстаў на базе вучэбных. На гэтым этапе ўзрастае метадычная вартасць рэфлексійных уменняў: уменне асэнсоўваць маўленчы вопыт, кантраляваць логіку і спосабы ўласнай дзейнасці, фіксаваць увагу на дапушчаных памылках, аналізаваць іх прычыны, прагназаваць адэкватныя прыёмы працы з чужымі і ўласнымі тэкстамі.

**Заключэнне.** Распрацаваная метадычная сістэма (падыходы, прынцыпы навучання, зместавыя лініі эксперыментальнай працы, метады і формы, сістэма практыкаванняў) забяспечвае фарміраванне тэкставай кампетэнцыі вучняў. Базавымі тэкставымі ўменнямі выступаюць: уменні аналізаваць логіка-кампазіцыйную структуру зыходнага тэксту; ствараць другасны тэкст

на аснове рэканструкцыі зместу і структуры зыходнага; ацэньваць уласны тэкст як праекцыю зыходнага з пазіцыі зместу, структуры, маўленчага афармлення (адэкватнае аперыраванне лінгвістычнай тэрміналогіяй, выкарыстанне традыцыйных формул для ўвядзення структурных кампанентаў тэксту (пачатак, асноўная частка, заключэнне), забеспячэнне лагічных пераходаў ад тэарэтычнай інфармацыі да канкрэтных прыкладаў, актыўнае ўжыванне тэрмінаадзінак).

*ЛІТАРАТУРА*


1. Звонников, В.И. Контроль качества обучения при аттестации: компетентностный подход / В.И. Звонников, М.Б. Челышкова. – М.: Логос, 2009. – 272 с.
2. Хуторской, А. В. Ключевые компетенции как компонент личностно ориентированной парадигмы образования / А.В. Хуторской // Народное образование. – 2003. – № 2. – С. 59–68.
3. Черепанова, Л.В. Формирование лингвистической компетенции при обучении русскому языку / Л.В. Черепанова. – Новосибирск: Наука, 2006. – 324 с.
4. Осмоловская, И. Ключевые компетенции и отбор содержания образования в школе / И. Осмоловская // Народное образование. – 2006. – № 5. – С. 77–80.
5. Дымарский, М.Я. Проблемы текстообразования и художественный текст / М.Я. Дымарский. – М.: Едиториал, 2001. – 284 с.
6. Ковалева, Г.С. Как дети читают и понимают текст / Г.С. Ковалева // Народное образование. – 2006. – № 5. – С. 71–76.
7. Короленко, Ж.В. Формирование текстовой компетенции учащихся лицея в иноязычном образовательном пространстве: автореф. ... дис. канд. пед. наук: 13.00.08 / Ж.В. Короленко; Ставроп. гос. ун-т. – Ставрополь, 2006. – 27 с.
8. Стражев, В.И. Международный образовательный проект PISA-2000 / В.И. Стражев // Нар. асвета. – 2005. – № 3. – С. 6–14.
9. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2001. – 212 с.
10. Мурина, Л.А. Проблема формирования коммуникативной компетенции / Л.А. Мурина // Русский язык и литература. – 2001. – № 1. – С. 10–14.
11. Войтик, Н.В. Актуализация педагогического потенциала учебного текста (на примере обучения иностранным языкам в вузе): автореф. … дис. канд. пед. наук: 13.00.01 / Н.В. Войтик; Тюмен. гос. ун-т. – Тюмень, 2004. – 22 с.
12. Федоров, Б.И. Развитие медиакомпетентности и критического мышления студентов педагогического вуза / Б.И. Федоров. – М.: Информация для всех, 2007. – 616 с.


*REFERENCES*


1. Zvonnikov V.I., Chelyishkova M.B. *Kontrol kachestva obucheniya pri attestatsii: kompetentnostnyiy podhod* [Control of Teaching Quality: Competence Approach], M.: Logos, 2009, 272 p.
2. Khutorskoy A.V. *Narodnoe obrazovaniye* [Public Education], 2003, 2, pp. 59–68.
3. Cherepanova L.V. *Formirovanie lingvisticheskoy kompetentsii pri obuchenii russkomu yazyiku* [Shaping Linguistic Competence while Teaching Russian], Novosibirsk, Nauka, 2006, 324 p.
4. Osmolovskaya I. *Narodnoe obrazovaniye* [Public Education], 2006, 5, pp. 77–80.
5. Dyimarskiy M.Ya. *Problemyi tekstoobrazovaniya i khudozhestvennyi tekst* [Issues of Text Building and Fiction Text], M.: Editorial, 2001, 284 p.
6. Kovaleva G.S. *Narodnoe obrazovaniye* [Public Education], 2006, 5, pp. 71–76.
7. Korolenko Zh.V. *Formirovanie tekstovoy kompetentsii uchaschihsya litseya v inoyazyichnom obrazovatelnom prostranstve: avtoref. dis. ... kand. ped. nauk: 13.00.08* [Shaping Text Competence of Lyceum Students in Foreign Language Educational Space: PhD Dissertation Summary], Stavrop. gos. un-t, Stavropol, 2006, 27 p.
8. Strazhev V.I. *Narodnaya asveta* [Public Education], 2005, № 3, pp. 6–14.
9. Protchanka V.U. *Aktualnyiya prablemyi teoryii i praktyiki navuchannya belaruskay move* [Topical Issues of the Theory and Practice of teaching Belarusian], Minsk, Nats. in-t adukatsyi, 2001, 212 p.
10. Murina L.A. *Russkiy yazyik i literatura* [Russian Language and literature], 2001, 1, pp. 10–14.
11. Voytik N.V. *Aktualizatsiya pedagogicheskogo potentsiala uchebnogo teksta (na primere obucheniya inostrannyim yazyikam v vuze): avtoref. dis. ... kand. ped. nauk: 13.00.01* [Actualization of Pedagogical Potential of the Academic Text (on the Example of Teaching Foreign Languages at the University): PhD Dissertation Summary], Tyumen. gos. un-t,Tyumen, 2004, 22 p.
12. Fedorov B.I. *Razvitie mediakompetentnosti i kriticheskogo myishleniya studentov pedagogicheskogo vuza* [Development of Media Competence and Critical Thinking of Pedagogical University Students], Moskva, Informatsiya dlya vsekh, 2007, 616 p.


*Поступила в редакцию 17.11.2014*

***Адрес для корреспонденции:*** e-mail: aspirantura@vsu.by – Васюковіч Л.С.